Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. 2017. № 2. С. 24–32
Journal of the Belarusian State University. Journalism and Pedagogics. 2017. No. 2. P. 24–32

*УДК 34:070(476)*

# БЕЛАРУСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

***М. В. ПРАХАРЭНЯ***[1*]

[1*]*Інстытут журналістыкі БДУ,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца асаблівасці развіцця канцэптуальных палажэнняў беларускай тэорыі грамадзянскай супольнасці. Адлюстроўваюцца асноўныя падыходы вучоных да трактоўкі паняцця «грамадзянская супольнасць», раскрываецца ўзаемасувязь гэтай катэгорыі з нацыянальным менталітэтам, духоўнымі і маральнымі каштоўнасцямі, ідэалогіяй беларускай дзяржавы. Вызначаюцца характэрныя рысы айчыннай мадэлі грамадзянскай супольнасці – трываласць ідэалаў гуманізму і агульначалавечых каштоўнасцей, высокі ўзровень прававой свядомасці, палітычнай культуры і сацыяльнага ўзаемадзеяння грамадзян, развітасць эканамічнай, культурнай і іншых сфер дзейнасці грамадства, наяўнасць свабоднага інфармацыйнага поля. Падкрэсліваецца асаблівая роля СМІ ў працэсе кансалідацыі соцыуму і станаўлення грамадзянскай супольнасці. Адзначаецца, што задача медыя сёння заключаецца ў тым, каб спрыяць партнёрскаму ўзаемадзеянню ўлады і соцыуму, ствараць прывабны вобраз грамадзянскай супольнасці ў масавай свядомасці, умацоўваць духоўна-маральныя асновы грамадства. Паказана, што менавіта праз СМІ адбываецца публічнае абмеркаванне найважнейшых пытанняў узаемаадносін дзяржаўнай і недзяржаўнай сфер, што, у сваю чаргу, прыводзіць да аб'ектыўнага ўзмацнення ролі масавай камунікацыі ў развіцці грамадзянскай супольнасці.

***Ключавыя словы:*** грамадзянская супольнасць; прававая дзяржава; грамадзянская супольнасць і СМІ; дзяржава; дэмакратычныя працэсы.

# БЕЛОРУССКАЯ КОНЦЕПЦИЯ ГРАЖДАНСКОГО ОБЩЕСТВА: ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

***М. В. ПРОХОРЕНЯ***[1)]

[1)]*Институт журналистики БГУ,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются особенности развития концептуальных положений белорусской теории гражданского общества. Отражаются основные подходы ученых к трактовке понятия «гражданское общество», раскрывается взаимосвязь этой категории с национальным менталитетом, духовными и моральными ценностями, идеологией белорусского государства. Определяются характерные черты отечественной модели гражданского общества – прочность идеалов гуманизма и общечеловеческих ценностей, высокий уровень правового сознания, политической культуры и социального взаимодействия граждан, развитость экономической, культурной и других сфер деятельности общества, наличие свободного информационного поля. Подчеркивается особая роль СМИ в процессе консолидации социума и становления гражданского общества. Отмечено, что задача медиа сегодня заключается в том, чтобы способствовать партнерскому взаимодействию власти и общества, создавать привлекательный образ гражданского

**Образец цитирования:**
Прахарэня М. В. Беларуская канцэпцыя грамадзянскай супольнасці: тэарэтыка-метадалагічны аспект // Журн. Белорус. гос. ун-та. Журналистика. Педагогика. 2017. № 2. С. 24–32.

**For citation:**
Prakharenya M. V. Belarusian concept of civil society: theoretical and methodological aspect. *J. Belarus. State Univ. Journalism. Pedagog.* 2017. No. 2. P. 24–32 (in Belarus.).

**Автор:**
***Марина Валерьевна Прохореня*** – аспирантка кафедры истории журналистики и менеджмента СМИ. Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент Н. А. Зубчонок.

**Author:**
***Maryna V. Prakharenya***, postgraduate student at the department of history of journalism and media management.
*marina.prohorenya@tut.by*

общества в массовом сознании, укреплять духовно-моральные основы социума. Показано, что именно через СМИ происходит публичное обсуждение важнейших вопросов взаимоотношений государственной и негосударственной сфер, что, в свою очередь, приводит к объективному росту значения массовой коммуникации во время развития гражданского общества.

***Ключевые слова:*** гражданское общество; правовое государство; гражданское общество и СМИ; государство; демократические процессы.

# BELARUSIAN CONCEPT OF CIVIL SOCIETY: THEORETICAL AND METHODOLOGICAL ASPECT

***M. V. PRAKHARENYA***[a]

[a]*The Institute of Journalism, Belarusian State University, 9 Kal'varyjskaja Street, Minsk 220004, Belarus*

The article is devoted to the peculiarities of the development of conceptual provisions of the Belarusian theory of civil society. The main points of view of Belarusian scientists on the concept of «civil society» are reflected. Reveals the relationship of this category with the national mentality, spiritual and moral values, the ideology of the Belarusian state. The characteristic features of the Belarusian model of civil society are defined as the affirmation of the ideals of humanism and universal human values, the high level of legal awareness, political culture and social interaction of citizens, the development of economic, cultural and other spheres of the society, the availability of a free information field. The special role of mass media in the process of consolidation of society and the formation of civil society is underlined. The task of the media today is to promote partnership between the authorities and the society, create an attractive image of civil society in the mass consciousness, and strengthen the spiritual and moral foundations of society. It is through the media that a public discussion of the most important issues of the relationship between the state and non-state spheres occurs, which, in turn, leads to an objective increase in the importance of mass communication during the development of civil society.

***Key words:*** civil society; constitutional state; civil society and the media; state; democratic processes.

Пытанні фарміравання ў Рэспубліцы Беларусь грамадзянскай супольнасці, уплыву яе інстытутаў на сацыяльна-эканамічную палітыку ў краіне, узаемадзеяння соцыуму і органаў улады сёння надзвычай актуальныя. Уступленне грамадства ў новую сталую фазу развіцця з'яўляецца перспектыўным сістэмаўтваральным фактарам яго стабільнасці. Неабходнасць удасканалення інстытута грамадзянскай супольнасці ў наш час звязана і з яго выключным значэннем у забеспячэнні сацыяльнай салідарнасці, абароне правоў грамадзян нашай краіны.

На сёння паняцце «грамадзянская супольнасць» мае шэраг вызначэнняў, паколькі не існуе яе ідэальнай мадэлі. Кожная краіна развіваецца па-свойму, таму ўзор грамадзянскай супольнасці нельга навязваць звонку. Гэта пагражае разбурэннем суб'ектнасці народа, стратай нацыянальнай ідэнтычнасці насельніцтва краіны, скасаваннем духоўных традыцый, унутраных структур менталітэту, асноўных прынцыпаў жыццядзейнасці грамадства.

За сваю доўгую гісторыю Беларусь прайшла ўласны адметны шлях фарміравання грамадзянскай супольнасці. Асаблівасці палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны вызначылі спецыфіку станаўлення грамадска-палітычнай думкі, нацыянальнага светапогляду, жыццёвага ўкладу народа, механізмы ўзаемадзеяння асобы, соцыуму і дзяржавы.

Канцэптуальныя палажэнні тэорыі грамадзянскай супольнасці, ідэі палітычных і грамадскіх свабод сталі фарміравацца на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст., у эпоху Адраджэння. Тэарэтычны падмурак асэнсавання палітыка-прававых асноў функцыянавання грамадства распрацоўвалі Францыск Скарына, Сымон Будны, Леў Сапега, Андрэй Волан, Васіль Цяпінскі, Міхалон Літвін і іншыя прадстаўнікі беларускай нацыянальнай культуры і грамадскай думкі.

На працягу XVI–XIX стст. адбывалася паступальнае развіццё тэорыі грамадзянскай супольнасці. Само паняцце ў той час яшчэ не ўвайшло ва ўжытак, аднак яго палажэнні вызначалі грамадска-палітычную думку. У складаных сацыяльна-палітычных умовах актыўна распрацоўваліся і неаднаразова пераасэнсоўваліся такія катэгорыі, як свабода асобы, сацыяльная справядлівасць, роўнасць усіх грамадзян перад законам, іх палітычныя і эканамічныя правы, удзел у кіраванні краінай, права на маёмасць, суверэннае нацыянальнае развіццё і інш.

Пачатак XX ст., які вызначыўся рэвалюцыйнымі падзеямі, стаў новым этапам у фарміраванні не толькі тэорыі грамадзянскай супольнасці, але

і яе практычнай рэалізацыі. Адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, якая паспрыяла праВядзенню дэмакратычных рэформ існуючага ладу. Так, Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. у краіне абвяшчаліся палітычныя правы, свабода сумлення, слова, сходаў, саюзаў і недатыкальнасць асобы, легалізаваліся дзейнасць палітычных партый, друк на нацыянальных мовах.

Гуманістычныя ідэі свабоды народа і асобы сталі галоўнымі ў творчасці прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі: Іван і Антон Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч, Янка Купала, Якуб Колас, Аляксандр Уласаў і іншыя дзеячы выступалі за сацыяльную справядлівасць, дэмакратызацыю грамадскага жыцця, павагу да нацыянальнай гісторыі і культуры. Гэтымі ідэямі былі прасякнуты публікацыі нацыянальных выданняў пачатку ХХ ст. – газет «Наша доля», «Наша ніва», «Вольная Беларусь», «Звон», «Беларусь» і інш.

У 1920-я гг. у савецкай краіне пачала складвацца адметная мадэль грамадзянскай супольнасці. Адносіны паміж людзьмі рэгуляваліся нормамі савецкай маралі, якая прапагандавала агульначалавечыя каштоўнасці – гуманізм, усеагульную роўнасць, патрыятызм.

Аднак адміністрацыйна-камандная сістэма, якая ўсталявалася ў савецкай краіне ў канцы 1920-х гг., фактычна знішчыла набыткі папярэдняга перыяду. Быў прыняты курс на змену ранейшай палітыкі і метадаў яе правядзення. Дзяржава пашырала свой уплыў, большай рэгламентацыі падвяргаліся грамадзянскія адносіны, умацоўваўся культ асобы. У такіх умовах далейшае развіццё элементаў грамадзянскай супольнасці стала немагчымым. Тым не менш актыўнае развіццё беларускай літаратуры і публіцыстыкі ў гэты час спрыяла станаўленню грамадскай актыўнасці, узгодненасці ідэй і поглядаў соцыуму, фарміраванню каштоўнасных арыентацый людзей.

Новым этапам тэарэтычнай распрацоўкі катэгорыі грамадзянскай супольнасці можна лічыць першую палову 1990-х гг., калі Беларусь набыла незалежнасць і пачала самастойна вызначаць вектар свайго далейшага развіцця. Распад ранейшай палітычнай сістэмы, абумоўлены ўнутранымі і знешнімі прычынамі, паставіў на першае месца праблему пошуку шляхоў рэфармавання грамадства, захавання яго стабільнасці.

Крызісныя з’явы ў сацыяльным, эканамічным і палітычным жыцці Беларусі выклікалі неабходнасць распрацоўкі нарматыўных актаў, якія сталі асновай прававога афармлення не толькі маладой дэмакратычнай суверэннай дзяржавы, але і арганізацыйных асноў фарміравання грамадзянскай супольнасці. Так, былі прыняты законы «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Беларускай ССР» (1991), «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» (1991), «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» (1992), «Аб прафесійных саюзах» (1992), «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду» (1992), «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці ў Рэспубліцы Беларусь» (1993), «Аб палітычных партыях» (1994), «Аб грамадскіх аб’яднаннях» (1994), «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» (1995) і інш.

Далейшыя дэмакратычныя пераўтварэнні былі замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай 15 сакавіка 1994 г. Паводле Асноўнага Закона, Беларусь з’яўляецца ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, а чалавек, яго правы, свабоды і гарантыя іх рэалізацыі – вышэйшай каштоўнасцю. Такім чынам, Канстытуцыя забяспечвала асновы прававой дзяржавы, ва ўмовах якой і можа развівацца грамадзянская супольнасць. Менавіта пры дапамозе структур прававой дзяржавы ствараюцца спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі аднаго з асноўных яе пастулатаў – абароны інтарэсаў грамадзян, а функцыянаванне грамадзянскай супольнасці станоўча ўплывае на будаўніцтва эфектыўнай мадэлі дэмакратычнага развіцця.

Неабходнасць распрацоўкі прававых і арганізацыйных асноў грамадзянскай супольнасці ўпершыню была адзначана ў лютым 1991 г. падчас навуковай канферэнцыі «Канцэпцыя Канстытуцыі БССР і фарміраванне прававых асноў грамадзянскай супольнасці і дзяржавы». Яе арганізатарамі выступілі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Канстытуцыйная камісія і юрыдычны факультэт БДУ. У межах дыскусіі аб праекце будучага Асноўнага Закона краіны ўдзельнікі мерапрыемства падкрэслілі, што канстытуцыйны лад павінен грунтавацца на прынцыпах гуманізму, справядлівасці, дэмакратызму і выступаць гарантам развіцця грамадзянскай супольнасці. На думку выступоўцаў, бліжэйшай перспектывай грамадзянскай супольнасці павінна быць усталяванне яе парытэту з дзяржавай. Значная ўвага была нададзена такім важным аспектам, як мясцовае самакіраванне, яго структура і кампетэнцыі, механізмы ўзаемаадносін з дзяржаўнай уладай, што было абумоўлена новымі рэаліямі, якія патрабавалі ўдасканалення сістэмы мясцовага самакіравання, што, у сваю чаргу, дазволіла б пабудаваць устойлівае грамадства [1; 2].

У гэты час было прапанавана адно з першых вызначэнняў паняцця «грамадзянская супольнасць». Пад ім разумелася «самарэгулюючая сістэма недзяржаўных адносін, якая спантанна ўзнікае ў выніку ўзаемадзеяння свабодных, раўнапраўных і юрыдычна незалежных адзін ад аднаго і дзяржавы грамадзян, іх добраахвотных аб’яднанняў»[1] [1, с. 17]. Адной з перадумоў станаўлення гэтага працэсу ў Беларусі палітолаг У. В. Роўда назваў дзей-

[1]Тут і далей пераклад наш. – *М. П.*

насць грамадскіх арганізацый культурна-адраджэнскага і экалагічнага напрамкаў.

Першым грунтоўным даследаваннем, у якім глыбока і рознабакова разглядалася сутнасць гэтага працэсу, паказваліся яго змест і супярэчнасці ў ім, стала калектыўная манаграфія «Праблемы фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі» [3]. У рабоце падрабязна аналізуюцца паняцце і структура грамадзянскай супольнасці, спецыфіка яе фарміравання ў Беларусі. Асаблівую ўвагу даследчыкі звярнулі на развіццё недзяржаўнага сектара эканомікі як асновы грамадзянскай супольнасці. Пасля аналізу вялікага аб'ёму статыстычных даных аўтары выявілі насцярожанае стаўленне да прыватнага сектара, зафіксаванае ў масавай свядомасці беларускага народа, што, у сваю чаргу, перашкаджала эфектыўнаму будаўніцтву грамадзянскай супольнасці [3, с. 26]. Былі названы і пазітыўныя змены, якія адбыліся ў сярэдзіне 1990-х гг. на шляху да палітычнай мадэрнізацыі беларускага грамадства – прыняцце Канстытуцыі, якая замацавала правы і свабоды грамадзян, усе формы ўласнасці, прэзідэнцкую форму кіравання, усенародныя выбары [3].

З цягам часу да навуковага асэнсавання катэгорыі грамадзянскай супольнасці сталі звяртацца шматлікія беларускія палітолагі, філосафы, сацыёлагі, гісторыкі і інш. Больш дэтальна аналізавалі гэты феномен у сваіх працах І. В. Катляроў, Л. Я. Крыштаповіч, Я. М. Бабосаў, А. Г. Слука, М. І. Дзямчук, С. Р. Драбязка, В. Э. Смірноў і інш. Навукоўцы не маюць адзінства поглядаў на сутнасць феномена грамадзянскай супольнасці, не прапануюць яго дакладнага вызначэння. Гэта тэндэнцыя характэрная і для сусветнай навуковай думкі.

Сёння ў айчыннай навуцы склаліся некалькі пунктаў гледжання на сутнасць паняцця «грамадзянская супольнасць». Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што пад ім разумеецца палітычная ці сацыяльная прастора для дзеянняў свабодных грамадзян. Адзін з ініцыятараў распрацоўкі канцэпцыі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі доктар сацыялагічных навук І. В. Катляроў сцвярджае, што «грамадзянская супольнасць – гэта грамадства, у якім адбываецца пераход асноўных уладных функцый ад дзяржавы да незалежных грамадскіх аб'яднанняў, здольных стварыць неабходныя ўмовы для рэалізацыі правоў і свабод грамадзян, самаарганізацыі асобы, рэалізацыі яе законных інтарэсаў і найважнейшых патрэб, росту грамадскай самадзейнасці і прававой свядомасці» [4, с. 13–14].

Паводле меркавання члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктара гістарычных навук У. А. Бабкова, грамадзянская супольнасць – гэта «сістэма самастойных і незалежных ад дзяржавы грамадскіх інстытутаў і адносін, якія павінны забяспечыць умовы для самарэалізацыі асобных індывідаў і калектываў, рэалізацыі прыватных інтарэсаў і патрэб» [5, с. 8].

Філосаф Л. Я. Крыштаповіч пад грамадзянскай супольнасцю разумее сукупнасць грамадскіх арганізацый, характэрных менавіта для дадзенага соцыуму і дзяржавы [6, с. 198].

Найбольш грунтоўным нам падаецца вызначэнне, прапанаванае Т. У. Окуневай. Даследчыца мяркуе, што грамадзянская супольнасць – гэта «грамадства свабодных і паўнапраўных грамадзян, якое фарміруецца на аснове прынцыпаў плюралізму і дэмакратыі, прававой роўнасці грамадзян, іх самавызначэння і самаарганізацыі, у якім адбываецца пераход некаторых уладных функцый ад дзяржавы да незалежных ад улады грамадскіх структур, здольных ствараць неабходныя і дастатковыя ўмовы для развіцця асобы, рэалізацыі яе правоў, прававой культуры» [7, с. 81].

Грамадзянская супольнасць у структуры соцыуму вывучалася і ў працах акадэміка Я. М. Бабосава. На думку вучонага, грамадзянская супольнасць – гэта спантанная самаарганізацыя індывідаў і добраахвотных арганізацый грамадзян, незалежных ад дзяржавы, якія дзейнічаюць у палітычнай, эканамічнай і сацыякультурнай сферах грамадства, абараняюцца прававымі ўстановамі і нормамі ад прамога ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў [8, с. 11]. Даследчыкам вызначаны характэрныя прыкметы грамадзянскай супольнасці (наяўнасць свабодных уладальнікаў сродкаў вытворчасці; развітасць і разгалінаванасць дэмакратыі; канстытуцыйна-адміністрацыйныя гарантыі шырокага спектра правоў, свабод і абавязкаў грамадзян і інш.) і вылучаны чатыры яе кампаненты – эканамічны, сацыяльны, палітычны і духоўны. Так, эканамічную аснову грамадзянскай супольнасці складаюць разнастайнасць і роўнасць форм уласнасці і развітай сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі. Грамадская згода сацыяльна-дэмаграфічных, прафесійных, сацыякультурных, этнанацыянальных, канфесійных груп насельніцтва ўваходзіць у склад сацыяльнага базісу грамадзянскай супольнасці. Палітычным падмуркам дадзенага феномена з'яўляюцца народаўладдзе, легітымнасць дзяржаўнай улады, наяўнасць легальнай і канструктыўна дзейнай апазіцыі, масавых прафсаюзных, маладзёжных, жаночых, ветэранскіх і іншых рухаў, дзейнасць незалежных СМІ. Духоўную аснову складаюць высокі ўзровень развіцця грамадскай свядомасці, культуры і маральнасці, плюралізм ідэалагічных дактрын, арганічнае спалучэнне нацыянальных традыцый і культурных каштоўнасцей з дасягненнямі сусветнай культуры, адукацыі і навукі [8, с. 10–11].

Такім чынам, сёння застаецца дыскусійным пытанне не толькі аб дакладным вызначэнні паняцця «грамадзянская супольнасць», але і аб яго структу-

ры. Тым не менш пералічаныя вышэй кампаненты грамадзянскай супольнасці цесна ўзаемазвязаны. Сістэмаўтваральным пачаткам і аб'яднальным фактарам для шматлікіх сувязей паміж імі выступае чалавек з яго натуральнымі патрэбамі і інтарэсамі, на абароне якіх заснавана логіка развіцця грамадзянскай супольнасці.

Даследчыкамі А. П. Марыкавым і А. В. Перапяліцам былі распрацаваны некаторыя палажэнні, якія павінны спрыяць афармленню інстытуцыянальнай структуры грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Так, агульнымі рэкамендацыямі для дзяржаўных структур могуць стаць арганізацыя ўмоў для фарміравання ў краіне сацыяльнай базы грамадзянскай супольнасці – устойлівага сярэдняга класа з адпаведнымі свядомасцю, палітычнымі паводзінамі, самаарганізацыяй і тыпам палітычнай культуры; стварэнне нарматыўнай прававой базы; строгае выкананне прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам; выключэнне развіцця карупцыйных працэсаў; зацвярджэнне ў грамадстве базавых каштоўнасцей дэмакратыі, незалежнай і справядлівай судовай сістэмы; выкананне норм выбарчага заканадаўства; правядзенне мэтанакіраванай маладзёжнай палітыкі, у якой моладзь павінна разглядацца як стратэгічны рэзерв дэмакратычных пераўтварэнняў; складванне перадумоў для фарміравання ў грамадстве талерантных працэсаў як асновы яго стабільнага развіцця і стварэння сацыяльнага асяроддзя для фарміравання грамадзянскай супольнасці [9, с. 113].

Ужо ў першых канцэпцыях беларускай грамадзянскай супольнасці значная ўвага з боку даследчыкаў акцэнтавалася на ўзаемадачыненні гэтага феномена з нацыянальна-духоўным развіццём народа. Навукоўцы адзначалі, што грамадзянская супольнасць і нацыянальны менталітэт – узаемавызначальныя катэгорыі, таму ўвага засяроджвалася на праблемах нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі і гістарычных падзеях, якія ўплывалі на фарміраванне самасвядомасці беларускага народа [10; 11].

Так, І. Катляроў адзначаў, што пры развіцці беларускай мадэлі ўзаемаадносін дзяржавы і грамадзянскай супольнасці трэба ўлічваць традыцыі, культуру, менталітэт, узровень прававой культуры і правасвядомасць беларускіх грамадзян [12, с. 88]. Даследчык прапанаваў стварыць мадэль, пры якой дзяржава гарантавала б бяспеку і годнае жыццё сваім грамадзянам, адказвала за якасць і наступствы кіраўнічых рашэнняў. Грамадзянская супольнасць, паводле І. Катлярова, таксама павінна пэўным чынам адказваць за сітуацыю ў краіне, не толькі кантраляваць дзейнасць органаў і інстытутаў улады, але і прымаць удзел у фарміраванні асноў стратэгіі нацыянальнага развіцця і дзяржаўнай ідэалогіі [12].

Любая дзяржава засноўваецца менавіта на ідэалогіі, якая вызначае задачы палітыкі, стратэгію развіцця грамадства, звязвае грамадзян адзінымі мэтамі і арыенцірамі, уяўленнямі аб мінулым, сучаснасці і будучыні. Доктар гістарычных прафесар А. Г. Слука, адзначаючы асаблівую кансалідуючую функцыю ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, яе важную ролю ў маральна-этычным і палітыка-эканамічным выхаванні, назваў у якасці яе асноўных дэмакратычных каштоўнасцей свабоду і сацыяльную справядлівасць – тыя катэгорыі, без якіх немагчымае існаванне грамадзянскай супольнасці [13].

Такім чынам, будаўніцтва грамадзянскай супольнасці не толькі выступае адным з глабальных нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, але і з'яўляецца важным элементам ідэалогіі нашай дзяржавы. Акрамя таго, дадзены працэс развіваецца ў сугуччы з нацыянальным менталітэтам, улічвае культурныя, духоўныя і маральныя каштоўнасці беларускага народа. Гэтаму садзейнічаюць СМІ, якім належыць выключная роля ў трансляцыі каштоўнасцей, кансалідацыі грамадства і, разам з тым, станаўленні грамадзянскай супольнасці.

Без моцных духоўных і гістарычных каранёў, традыцый, прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, захавання гісторыка-культурнай спадчыны немагчымае паспяховае будаўніцтва грамадзянскай супольнасці. Сёння беларускія СМІ беражліва ставяцца да гістарычнай памяці, рэалізуюць шматлікія праекты патрыятычнага кірунку, умацоўваюць духоўна-маральныя асновы нашага грамадства. Так, напрыклад, на працягу многіх гадоў традыцыйнымі рубрыкамі для абласной газеты «Мінская праўда» сталі наступныя: «Старонкі гісторыі», «Спадчына», «Гісторыя Міншчыны», «Радавыя Вялікай Перамогі», «Адраджэнне», «Радавод Міншчыны», «Незабыўнае», «Прадзіва вечнасці», «На тэмы маралі» і інш.

Асаблівае значэнне СМІ ў фарміраванні і ўмацаванні духоўна-маральных арыентацый грамадства неаднаразова адзначалася міністрам інфармацыі Рэспублікі Беларусь Л. С. Ананіч падчас работы круглых сталоў «Культура як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцей. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў» (ліпень 2015 г.), «Сугучча: слова Скарыны ў сучасным свеце» (верасень 2016 г.), «Моцная сям'я – моцная дзяржава: маральныя ўстоі грамадства і дзяржавы» (кастрычнік 2016 г.) і інш. На сустрэчы з маладымі журналістамі ў лістападзе 2016 г. Л. С. Ананіч падкрэсліла: «Маральнасць – гэта не толькі найважнейшы складнік чалавечай асобы, але і адна з галоўных грамадскіх катэгорый. Фундамент развіцця грамадства – гэта заўсёды маральнасць у дачыненні да людзей, у будаўніцтве будучага краіны, у адносінах да мі-

нулага. Асаблівую ролю ў працэсе фарміравання маральнага жыцця грамадства адыгрываюць журналісты» [14].

Грамадзянская супольнасць у нашай краіне на гэты момант ужо прайшла важны этап станаўлення. Створаны і функцыянуюць асноўныя інстытуты, з дапамогай якіх задавальняюцца інтарэсы грамадзян: палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні, незалежныя СМІ; распрацаваны юрыдычныя нормы, якія рэгулююць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, яго ўдзел у рэферэндумах, выбарах і Усебеларускім народным сходзе, мясцовым самакіраванні, адносіны форм уласнасці. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе кожнаму грамадзяніну роўнасць перад законам, аднолькавыя магчымасці, плюралізм форм уласнасці, палітычных партый і аб'яднанняў, прыярытэт права, сацыяльную падтрымку, спрыяльныя ўмовы для развіцця асобы і інш. Такім чынам, тыя фундаментальныя прынцыпы, якія закладваюць падмурак для фарміравання грамадзянскай супольнасці, былі замацаваны ў Канстытуцыі. Аднак актыўнасць насельніцтва па-ранейшаму застаецца невысокай. У сувязі з гэтым кампаненты грамадзянскай супольнасці, якія маглі б весці раўнапраўны дыялог з уладай, развіваюцца вельмі павольна.

У Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага схода 21 красавіка 2017 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка адзначыў: «Актыўная роля дзяржавы – гэта важная ўмова ўстойлівага, збалансаванага развіцця краіны. Асабліва гэта тычыцца Беларусі, дзе менталітэт народа стагоддзямі фарміраваўся пад уплывам ідэй моцнай дзяржаўнасці» [15]. У сувязі з гэтым цалкам натуральна, што ў беларускай мадэлі грамадзянскай супольнасці асаблівае значэнне набывае актыўная роля дзяржавы.

Многія беларускія даследчыкі падкрэсліваюць вялікае значэнне дзяржавы ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці. Так, А. Уласаў выказаў думку пра тое, што грамадзянская супольнасць з'яўляецца асновай дзяржавы, носьбітам яе суверэнітэту і адзінай крыніцай утварэння цэласнай дзяржаўнай улады з размежаваннем функцый і паўнамоцтваў яе органаў [16, с. 128].

Такім чынам, грамадзянская супольнасць і дзяржава – узаемаабумоўленыя велічыні, якія не выключаюць, а дапаўняюць адна адну. Дзяржава павінна актыўна ўдзельнічаць у стварэнні ўмоў для фарміравання грамадзянскай супольнасці: падтрымліваць грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі, пашыраць іх магчымасці кіравання грамадствам. Грамадзянскай супольнасці, у сваю чаргу, трэба кантраляваць органы ўлады праз пэўныя механізмы: палітычныя партыі, прафесійныя саюзы, нацыянальна-культурныя і рэлігійныя аб'яднанні, сістэму мясцовага самакіравання і г. д. [12].

Айчынная даследчыца Л. В. Вансовіч актыўную ролю дзяржавы ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці абгрунтоўвае наступным чынам. Папершае, Беларусь належыць да краін, арыентаваных на дзяржаву, а не на грамадства. У свядомасці людзей існуе перакананне ў неабходнасці моцнай дзяржавы і ўлады. У сувязі з гэтым, на думку даследчыцы, наш соцыум недастаткова аўтаномны, а жыццё грамадзян часта залежыць ад рашэнняў асобных палітычных сіл. Па-другое, грамадская дзейнасць і набыццё грамадзянскіх правоў і свабод гістарычна ажыццяўлялася шляхам вылучэння чалавека на аснове мясцовага самакіравання. Агульныя рэгулятыўныя функцыі абшчыны распаўсюджваліся на ўсё грамадства. Гэта надало нацыянальную спецыфіку працэсу станаўлення грамадзянскай супольнасці, крыху запаволіўшы яе развіццё і абумовіўшы значную залежнасць ад дзяржавы. Па-трэцяе, сацыяльным лідарам станаўлення грамадзянскай супольнасці ў Беларусі з'яўляецца не слой прадпрымальнікаў, як на Захадзе, а інтэлігенцыя. Гэта звужае эканамічныя магчымасці развіцця грамадзянскай супольнасці. Пачацвёртае, станаўленне гэтага інстытута ў Беларусі працякае на высокім узроўні міжэтнічнай і міжсацыяльнай інтэграцыі, што пазбаўляе ад шматлікіх канфліктаў, якія мелі месца ў іншых краінах. Акрамя таго, беларускае грамадства па-ранейшаму грунтуецца на калектывісцкай мадэлі ўзаемаадносін паміж грамадзянамі і інстытутамі [17].

Падобнай пазіцыі прытрымліваецца С. Я. Кружалава. На падставе аналізу сацыякультурных асноў грамадзянскай супольнасці даследчыца адзначала, што арганічнай часткай нацыянальнай свядомасці беларусаў з'яўляецца маральная сувязь паміж дзяржавай і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці. Характэрная рыса нацыянальнай беларускай мадэлі грамадзянскай супольнасці – этыка калектывізму, якая звязвае яе з палітычнай уладай [18].

Фарміраванне грамадзянскай супольнасці – вельмі працяглы працэс, абумоўлены шэрагам фактараў. Так, вялікая роля ў ім належыць сярэдняму класу [19–21]. Прадстаўнікі гэтай катэгорыі насельніцтва маюць высокую кваліфікацыю, сталае месца працы і пастаянны даход, дзякуючы якому забяспечваецца эканамічная, сацыякультурная і сямейна-бытавая дзейнасць чалавека. Прафесар А. Г. Слука адзначаў, што «сярэдні клас – стабільнасць дзяржавы ўстойлівага развіцця» [21, с. 190]. Без матэрыяльна зябяспечаных і высокаінтэлектуальных спецыялістаў немагчыма павысіць якасць вытворчага працэсу, пабудаваць навукаёмістую эканоміку. Культурна-адукацыйны патэнцыял і інтэлігентнасць сярэдняга класа забяспечваюць яго талерантнасць, зацікаўленасць у абароне сваіх інтарэсаў праз актыўны ўдзел у палітычным жыцці краі-

ны, гатоўнасць весці дыялог і ісці на кампраміс. Менавіта гэта частка соцыуму гарантуе эфектыўнае функцыянаванне грамадзянскай супольнасці і стварае трывалую аснову для пабудовы прававой дзяржавы.

Грамадзянская супольнасць у Беларусі заўсёды была і будзе цесна звязана з дзяржавай. Асновай падобнай узаемасувязі выступае агульнасць грамадскіх інтарэсаў і мэт. У адрозненне ад ліберальнай эканомікацэнтрысцкай мадэлі, у аснову якой закладзена этыка індывідуалізму – індывідаў, звязаных пераважна вытворчымі адносінамі, – у нашай краіне склалася асаблівая мадэль грамадзянскай супольнасці, заснаваная на этыцы калектывізму, дзе індывіды аб'яднаны агульнымі маральнымі каштоўнасцямі, такімі як любоў да радзімы, свайго народа, яго традыцый, прыхільнасць да моцнай дзяржавы і яе інстытутаў, сацыяльная справядлівасць. Характэрныя яе рысы – сцвярджэнне ідэалаў гуманізму і агульначалавечых каштоўнасцей, высокі ўзровень прававой свядомасці, палітычнай культуры і сацыяльнага ўзаемадзеяння грамадзян, развітасць эканамічнай, культурнай і іншых сфер дзейнасці грамадства, наяўнасць свабоднага інфармацыйнага поля, незалежнасць ад дзяржаўных структур, аднак у той жа час – узаемадзеянне з імі (менавіта з дапамогай дзяржаўных структур ствараюцца спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі аднаго з асноўных пастулатаў грамадзянскай супольнасці – абароны інтарэсаў грамадзян).

Такім чынам, сёння беларускімі навукоўцамі актыўна распрацоўваецца мадэль грамадзянскай супольнасці, накіраванай на абарону агульначалавечых каштоўнасцей, – натуральнага права чалавека на жыццё і свабоду, прызнання роўнасці ўсіх людзей. Айчыннае тэарэтыка-метадалагічнае вывучэнне гэтага паняцця паказала, што агульнасць любых форм сацыяльнага ўзаемадзеяння стварае ўмовы для палітычнай, эканамічнай, сацыякультурнай і сямейна-бытавой дзейнасці, спрыяе рэалізацыі інтарэсаў і патрэб асобы, сацыяльных груп і аб'яднанняў.

Галоўная задача грамадзян Беларусі сёння – замацаваць станоўчыя тэндэнцыі грамадзянскай супольнасці, стварыць спрыяльныя ўмовы для яе далейшага развіцця. Актыўны ўдзел у гэтым працэсе павінны прымаць СМІ, задача якіх заключаецца ў тым, каб садзейнічаць партнёрскаму ўзаемадзеянню ўлады і соцыуму, ствараць прывабны вобраз грамадзянскай супольнасці ў масавай свядомасці. Менавіта праз СМІ адбываецца публічнае абмеркаванне найважнейшых пытанняў узаемаадносін дзяржаўнай і недзяржаўнай сфер. Гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да аб'ектыўнага павелічэння значэння масавай камунікацыі падчас развіцця грамадзянскай супольнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Концепция Конституции БССР и формирование правовых основ гражданского общества и государства : тез. докл. респ. науч.-практ. конф. (Минск, 27–28 февр. 1991 г.) : в 2 т. / редкол.: А. А. Головко (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 1991. Т. 1.

2. Концепция Конституции БССР и формирование правовых основ гражданского общества и государства : тез. докл. респ. науч.-практ. конф. (Минск, 27–28 февр. 1991 г.) : в 2 т. / редкол.: А. А. Головко (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 1991. Т. 2.

3. *Карбалевич В. И., Ровдо В. В., Чернов В. Ю., Шабайлов В. И.* Проблемы формирования гражданского общества в Беларуси. Минск : НЦСИ «Восток–Запад», 1996.

4. Проблемы и перспективы становления гражданского общества : в 2 ч. / редкол.: Ю. М. Бубнов (отв. ред.) [и др.]. Могилёв : МГУП, 2010. Ч. 1.

5. Становление гражданского общества в Беларуси в контексте устойчивого развития : материалы Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 24–26 мая 1999 г.) / под ред. Н. Г. Павлова [и др.]. Минск : Тесей, 1999.

6. *Криштапович Л. Е.* К проблеме гражданского общества // Белорусская политология: многообразие в единстве. Республика Беларусь в глобализирующемся мире : тез. докл. IV Междунар. науч.-практ. конф. (Гродно, 13–14 мая 2010 г.) : в 2 ч. / редкол.: В. Н. Ватыль (отв. ред.) [и др.]. Гродно, 2010. Ч. 1. С. 197–200.

7. *Окунева Т. В.* Гражданское общество в зеркале социологических исследований // Социальное знание и современные проблемы развития белорусского общества : материалы Междунар. науч.-практ. конф. (21–22 ноября 2013 г.) / редкол.: И. В. Котляров (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2013. С. 80–83.

8. *Бабосов Е. М., Бубнов Ю. М., Котляров И. В. и др.* Гражданское общество и государство (очерки теории и практики взаимодействия). Могилёв : МГУП, 2014.

9. *Мариков О. П., Перепелица Е. В.* Проблемы и перспективы развития гражданского общества в Республике Беларусь // Право в современном белорусском обществе : сб. науч. тр. Минск, 2007. Вып. 2. С. 108–125.

10. Грамадзянская супольнасць і праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ў Беларусі : матэрыялы навук.-практ. семінара (Мінск, 30–31 мая 1996 г.) / навук. рэд. В. Ф. Голубеў, П. А. Лойка. Брэст : рэд. газ. «Шлях», 1996.

11. Национальная идея и национальные интересы Республики Беларусь : материалы Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 19 нояб. 1998 г.) / науч. ред. И. В. Котляров [и др.]. Минск : Интститут социально-политических исследований, 1999.

12. *Котляров И.* Государство vs гражданское общество: в поисках оптимальной модели // Белая вежа. 2015. № 12. С. 73–89.
13. *Слука А. Г.* Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці (метадалогія фарміравання). Мінск : Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2007.
14. Ананич: Журналисты играют особую роль в формировании нравственного общества [Электронный ресурс]. URL: http://www.belta.by/society/view/ananich-zhurnalisty-igrajut-osobuju-rol-v-formirovanii-nravstvennogo-obschestva-219828-2016/ (дата обращения: 02.05.2017).
15. Выступление Александра Лукашенко при обращении с ежегодным Посланием к белорусскому народу и Национальному собранию [Электронный ресурс]. URL: https://www.sb.by/articles/sila-v-pravde-21-04-2017.html (дата обращения: 24.04.2017).
16. *Власов А.* Будущее Беларуси – в становлении и развитии гражданского общества // Нёман. 2003. № 5. С. 128–132.
17. *Вонсович Л. В.* Роль государства и гражданского общества в обеспечении устойчивого развития // Взаимодействие устойчивости и инновационности в развитии белорусского общества : сб. науч. тр. Минск, 2009. С. 16–39.
18. *Кружалова С. Е.* Формирование гражданского общества в Республике Беларусь: проблема социокультурных оснований // Философия и соц. науки. 2007. № 4. С. 18–21.
19. *Вонсович Л. В.* Проблемы формирования гражданского общества в современной Беларуси // Беларусь в современном мире : материалы VIII Междунар. конф., посвящ. 88-летию образования Белорус. гос. ун-та (Минск, 30 окт. 2009 г.) / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. Минск, 2009. С. 281–282.
20. *Ермак О. И.* Гражданское общество – объективная потребность времени // Беларус. думка. 2010. № 10. С. 116–119.
21. *Слука О. Г.* Методология формирования гражданского общества // Проблемы упр. 2010. № 2. С. 186–195.

## References

1. Golovko A. A., Vasilevich G. A., Vashkevich A. E., et al. (eds). [The concept of the Constitution of the BSSR and the formation of the legal foundations of civil society and the state] : abstr. of the repub. sci. and pract. conf. (Minsk, 27–28 Febr., 1991) : in 2 vol. Minsk : BSU, 1991. Vol. 1 (in Russ.).
2. Golovko A. A., Vasilevich G. A., Vashkevich A. E., et al. (eds). [The concept of the Constitution of the BSSR and the formation of the legal foundations of civil society and the state] : abstr. of the repub. sci. and pract. conf. (Minsk, 27–28 Febr., 1991) : in 2 vol. Minsk : BSU, 1991. Vol. 2 (in Russ.).
3. Karbalevich V. I., Rovdo V. V., Chernov V. Y., Shabailov V. I. [Problems of the formation of civil society in Belarus]. Minsk : NTSSI «Vostok–Zapad», 1996 (in Russ.).
4. Bubnov Y. M., Bobkova T. G., Pushkin I. A., et al. (eds). [Problems and prospects for the formation of civil society] : in 2 parts. Mogilev : MGUP, 2010. Part 1 (in Russ.).
5. Pavlov N. G., Leskova T. A., Melnik V. A. (eds). [Formation of civil society in Belarus in the context of sustainable development] : materials of the Int. sci. and pract. conf. (Minsk, 24–26 May, 1999). Minsk : Tesei, 1999 (in Russ.).
6. Krishtapovich L. E. [To the problem of civil society]. *Belorusskaya politologiya: mnogoobrazie v edinstve. Respublika Belarus' v globaliziruyushchemsya mire* [Belarusian political science: diversity in unity. The Republic of Belarus in the Globalizing World]: abstr. of the IV Int. sci. and pract. conf. (Hrodna, 13–14 May, 2010) : in 2 parts. Hrodna, 2010. Part 1. P. 197–200 (in Russ.).
7. Okuneva T. V. [Civil Society in the mirror of sociological research]. *Sotsial'noe znanie i sovremennye problemy razvitiya belorusskogo obshchestva* [Social knowledge and contemporary problems of the development of Belarusian society] : proc. of the Int. sci. and pract. conf. (Minsk, 21–22 Novemb., 2013). Minsk, 2013. P. 80–83 (in Russ.).
8. Babosov E. M., Bubnov Y. M., Kotlyarov I. V., et al. [Civil Society and the State (essays on the theory and practice of interaction)]. Mogilev : MGUP, 2014.
9. Marikov O. P., Perepelitsa E. V. [Problems and perspectives of development of civil society in the Republic of Belarus]. *Pravo v sovremennom belorusskom obshchestve* [Law in the modern Belarusian society] : collect. of sci. works. Minsk, 2007. Issue 2. P. 108–125.
10. Holubeu V. F., Lojka P. A. (eds). [Civil society and the problems of the national cultural identity in Belarus] : materials of sci.-pract. semin. (Minsk, 30–31 May, 1996). Brest : Newsp. ed. «Shljah», 1996 (in Belarus.).
11. Kotlyarov I. V., Krishtapovich L. E., Lych L. M. (eds). [National idea and national interests of the Republic of Belarus] : materials of the Int. sci.-pract. conf. (Minsk, 19 Novemb., 1998). Minsk : Institute of the Social and Political Studies, 1999 (in Russ.).
12. Kotlyarov I. [The state vs civil society: in search of the optimal model]. *Belaja Vezha*. 2015. No. 12. P. 73–89 (in Russ.).
13. Sluka A. G. [The ideology of the Belarusian state system (methodology of the formation)]. Minsk : Republuc Institute of the Higher School, 2007 (in Belarus.).
14. [Ananich: journalists play a special role in the formation of a moral society]. URL: http://www.belta.by/society/view/ananich-zhurnalisty-igrajut-osobuju-rol-v-formirovanii-nravstvennogo-obschestva-219828-2016/ (date of access: 02.05.2017) (in Russ.).
15. [Speech by Alexander Lukashenko at the address to the annual Address to the Belarusian people and the National Assembly]. URL: https://www.sb.by/articles/sila-v-pravde-21-04-2017.html (date of access: 24.04.2017).
16. Vlasov A. [The Future of Belarus – in the formation and development of civil society]. *Nyoman*. 2003. No. 5. P. 128–132 (in Russ.).

17. Vonsovich L. V. [The role of the state and civil society in ensuring sustainable development]. *Vzaimodeistvie ustoichivosti i innovatsionnosti v razvitii belorusskogo obshchestva* [The interaction of sustainability and innovation in the development of Belarusian society]: collect. of sci. papers. Minsk, 2009. P. 16–39 (in Russ.).
18. Kruzhalova S. E. [Formation of civil society in the Republic of Belarus: the problem of sociocultural foundations]. *Filosofiya i sots. nauki* [Philosophy and social sciences]. 2007. No. 4. P. 18–21 (in Russ.).
19. Vonsovich L. V. [Problems of civil society formation in contemporary Belarus]. *Belarus' v sovremennom mire* [Belarus in the modern world] : proc. of the VIII Int. conf. dedic. to the 88th anniv. of the form. of the Belarus. State Univ. (Minsk, 30 Oct., 2009). Minsk, 2009. P. 281–282 (in Russ.).
20. Ermak O. I. [Civil society – the objective need of time]. *Belarus. dumka*. 2010. No. 10. P. 116–119 (in Russ.).
21. Sluka O. G. [Methodology of civil society formation]. *Problemy upravleniya*. 2010. No. 2. P. 186–195 (in Russ.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 05.04.2017.*
*Received by editorial board 05.04.2017.*